**ІЛЬЯ́**, Ілля, Гальяш, свята ў гонар старазапаветнага прарока Ільі (2 жніўня н.ст.). Дзякуючы сваёй набожнасці і змаганню за пашану Бога тварыў цуды і быў узяты жывым на неба. У значнай ступені папярэднікам І. ў язычніцкай міфалогіі можна лічыць *Перуна*. Паводле хрысціянскіх уяўленняў, ад святога І. залежыць насыланне дажджоў, а значыць — ураджай. І. — распараджальнік дажджоў і навальніц, апякун земляробства, абаронца ад нячыстай сілы. На І. стараліся не працаваць, каб не прагнявіць гэтага найпапулярнейшага ў народзе святога, які, раз'язджаючы па небе ў вогненнай калясніцы, можа наслаць пажары на зямлю, град і засуху. Таму дзень І. на Беларусі святкаваўся паўсюдна. У засушлівае надвор'е І. служылі малебны, у якасці ахвяры яму клалі яйкі ў баразнах між градаў. Лічылася, што І. ў свой дзень павінен прыйсці з дажджом: «Ілля наробіць гнілля». Калі ўвесь час ліў дождж, казалі, што І. запаліў адзежу і залівае агонь вадою з хмараў, а у час засухі — што І. сушыць адзежу. Існавалі на гэты дзень больш-менш рацыянальныя аграрныя і метэаралагічныя назіранні: «Калі дождж — будзе жыта ядронае, але маланка папаліць арэхі; калі пагода — павінен быць добры сенакос; калі спякота — трэба чакаць працяглай зімы». Ад І. звычайна пачыналася жніво: «Святая Ілля — слаўна жняя», «Святы Ілья копы лічыць». Выспяванне жыта часам вывяралі па ягадах у лесе: паспелі на І. чарніцы, значыць, паспела і жыта. Тады ўжо прыказка вуснамі дбайнай гаспадыні сцвярджала: «На Ільюю поўну печ хлеба налью», «На Гальяша з новых круп каша». Дзесьці каля І. трэба было «брацца да раллі» — пачыналі араць папар, рыхтуючыся спакваля да сяўбы азімых: «Да Ільі хоць адным зубам зямлі парні». Свае назіранні мелі і бортнікі: паводле іх сцвярджэнняў, надзейныя раі былі тыя, што выйшлі да І., пасля ж гэтай даты раі амаль нічога не вартыя і іх лепш не асаджваць, а адпускаць: «Толькі да Іллі паглядай на вуллі». Дзень І. ўспрымалі як рубеж паміж летам і восенню: «Ілья жніво пачынае, а лета канчае», «Прыйшоў Ілья — і лета няма», «На Ільюю да абеду лета, а па абедзе восень», «Да Ільі поп просіць Бога пра дождж, а з Ільі і баба хвартухом яго нагоніць». Менавіта з гэтага дня забаранялася купацца. «Прыйшоў Ілья і ўкінуў у ваду алядня». Калі, маючы на ўвазе паступовае скарачэнне дня, пра папярэдніх святых гаварылі, што «Пётра-Павел час убавіў», то на гэта свята дадавалі: «Ілья-прарок — два ўвалок».

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998. С. 496—500; Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі. Мн., 1990.

*У.А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ